Яскравымі п'есамі папоўніўся рэпертуар дамрыстаў. Сярод твораў кампазітараў Беларусі для домры «Гумарэска» В.Войціка, «Шэсце-гратэск», «Канцэрт», «Скерца» Г.Ермачэнкава, «Канцэрціна», «Фантастычны танец» В.Малых, два канцэрты, п'есы «Чаму ж мне не пець?», «Фіеста» А.Клеванца, «Сюіта ў стылі рэтра» Э.Тырманд, «Беларуская полька» Л.Шлег.

На жаль, як і раней, невялікая колькасць твораў кампазітарамі Беларусі напісана для балалайкі. Але амаль у кожнага прафесійнага балалаечніка ў рэпертуары ёсць п'есы У.Солтана, Я.Глебава, Г.Гарэлавай, Г.Ермачэнкава, Л.Шлег.

На сучасным этапе з'явіліся першыя арыгінальныя творы беларускіх кампазітараў для гітары. Гэта п'есы В.Жывалеўскага, яго цыкл «Беларускія фантазіі ў старадаўнім стылі», «Прэлюдыя памяці Э.Віла-Лобаса» В.Войціка, цыкл У.Захарава «Настальгія па Вялікім княстве», «Цыкл у некласічным стылі» А.Літвіноўскага, «Тры навелеты» Я.Паплаўскага, «Паўстанцкая быліна» Г.Шэмета.

Поспехі выканаўцаў на народных духавых інструментах далі стымул кампазітарам для напісання музыкі для дудкі.

Народна-інструментальная музыка прыцягвае ўвагу беларускіх кампазітараў, і няма амаль ніводнага з іх, хто б не пісаў музыку для асобных народных інструментаў, ансамбляў ці аркестраў.

**Э.А.Усоўская,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## ПОСТМАДЭРНІЗМ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Сучасная беларуская культура з'яўляецца своеасаблівым люстэркам сацыякультурных падзей, якія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбываюцца ў свеце. Практычна ва ўсіх відах мастацтва ёсць прадстаўнікі самых розных кірункаў і стыляў — ад класічна рэалістычнага да трансавангарду. Не выключэнне з гэтага і постмадэрнізм. Сутнасць постмадэрнісцкага феномена трактуецца даволі шырока. Не выпадкова, што свае нацыянальныя школы маюць Злучаныя Штаты, Францыя і іншыя краіны. У Беларусі постмадэрнізм таксама мае свае асаблівасці. Апошнія склаліся ў выніку розных фактараў — гістарычных, этнічных, геапалітычных і інш. Адной з адметных рыс беларускага постмадэрнізму можна лічыць яго андэграўндны характар. Постмадэрнісцкія тэндэнцыі існуюць быццам самі па сабе: постмадэрнізм ёсць, але ён не рэкламуецца. Як ні парадаксальна, нягледзячы на адносную замкнёнасць, постмадэрнізм у Беларусі носіць адкрыты і інтэрпрэтацыйны характар. Спектр трактоўкі яго даволі вялікі. Таму часцей за ўсё да постмадэрнізму ставяцца як да такой канцэпцыі, якая дае дарогу ўсяму неардынарнаму.

Найбольш папулярнымі рысамі постмадэрнісцкага мастацтва, якія ўжываюцца беларускімі мастакамі-літаратарамі, з'яўляюцца цытатнасць і звяртанне да гістарычных алюзій.

Адным з цікавых раманаў-цытат можна лічыць твор Аляксандра Лукашука "1982". Сам аўтар жыве ў Празе, але яго творы друкуюцца ў Беларусі. Гэта, у прыватнасці, "Здзек", а таксама "Філіствіч. Вяртанне нацыяналіста". Раман "1982" уяўляе кангламерат вытрымак-цытат з часопісаў і газет. Яны закранаюць амаль усе бакі жыцця Савецкай краіны, краін сацыялістычнай садружнасці, а таксама Амерыкі. Лозунгі аб спаборніцтве і ўдарнай працы, паведамленні аб зборы бульбы, смерці Л.І.Брэжнева, барацьбе неграў за правы на першы погляд нічым паміж сабой не звязаны. Можа, яно і так. Магчыма, Аляксандр Лукашук проста ўзяў з арыгіналаў тое, што яму падабаецца, і зрабіў раман. Але, на нашу думку, — гэта мэтанакіраваная гульня з чытачом. Тут можна знайсці блізкія па сэнсе кавалкі, аб'яднаныя іранічным падтэкстам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку з мноства цытат складаецца даволі цікавая карціна 1982 г. Чытачу прапануецца інтэрпрэтаваць прачытанае на свой густ.

Не апошняе месца займае постмадэрнісцкая інтэрпрэтацыя з апорай на ўжыванне розных сэнсавых кодаў-цытацый у творчасці мастака-фотакалажыста Тодара Конпы. Кожны прадмет калажу набывае асабістае жыццё, што не адмаўляе неабходнасці існавання іншых аб'ектаў. Іх самастойнасць абумоўліваецца ўзаемасувяззю, у аснове якой агульная ідэя. Важнасць пачынаюць набываць не толькі сам тэкст калажу, але і яго кантэкст. Такім чынам, паміж прадметамі-структурамі адбываецца дыялог, з аднаго боку, а з другога — яны пачынаюць размову з гледачом, якому неабходна далучыць і свой інтэлектуальны багаж, і інтуітыўна-вобразнае мысленне, каб уключыцца ў жыццё карціны. Гэта датычыцца серыі калажаў “Сэнсамабілізацыя”, “Polterhajst”. На першы план тут выступае кантэкстуальны рад: быційны, гістарычны, мастацкі, духоўна-інтэлектуальны, афіцыйнай і неафіцыйнай ідэалогіі. Элементы, якія складаюць мастацкі рад, фарміруюцца вакол прадметаў прасторы. Апошняя, у сваю чаргу, не замыкаецца ў абмежаваную сістэму, а выяўляе адкрытае поле для інтэрпрэтацыі. Экскурс у гістарычную памяць чалавецтва актуалізуе і так званыя вечныя пытанні, напрыклад: “Што ёсць жыццё, смерць, нараджэнне, мужчына і жанчына?” Разрозненыя вобразы-рэчы змыкаюцца і ў пэўны момант становяцца агульнымі. Адзінае зноў можа распасціся на вачах у гледача, а з асколкаў мазаікі ўзнікне новае апавяданне-асацыяцыя.

Акрамя традыцыйных формаў постмадэрнісцкай практыкі калажу і пастышу, а таксама ўжывання гістарычных матываў, аматары новай эстэтыкі звяртаюцца да так званага непрафесійнага мастацтва. У дадзеным выпадку гэта датычыцца інсіту.

Як вядома, постмадэрнізм адмаўляе супрацьпастаўленне аб'екта і суб'екта і не падзяляе ўсё на апазіцыі. Для яго існуе багатая прастора жыцця, якое “размывае”

межы мастацтва, зацягвае ва ўласны паток. Да таго ж інсітнае мастацтва прываблівае сваёй непасрэднасцю, чысцінёй, сінкрэтычнасцю.

Цікавасць да так званага наіўнага мастацтва ўзнікла яшчэ ў другой палове XX ст. "Прымітывізм" Руса, Пірасмані знайшоў адлюстраванне ў творчасці Пікасо, Ларыёнава, Кандзінскага, Шагала. У 1966-м г., ён атрымаў сваю назву дзякуючы Стэфану Ткачу, стварыўшаму Міжнародны кабінет інсітнага мастацтва пры Славацкай нацыянальнай галерэі. Нягледзячы на некаторую ўмоўнасць, гэты тэрмін даволі ёмка перадае сутнасць непрафесійнай творчасці (у перакладзе з лацінскай мовы insitus — натуральнасць, арыгінальнасць). Творы інсітных мастакоў паказваюць некалькі іншую карціну быцця, чым бачыць яго чалавек напрыканцы стагоддзя. Разарванасць, фрагментарнасць разумення знікаюць: перад намі паўстае свет каштоўнасцей, за якім ідзе разуменне вышэйшага сэнсу быцця. Работы Н.Тарасюка, Ф,Максімава, М.Сайфугаліевай, П.Тарасюка, М.Байцова, В.Кавалеўскага пацвярджаюць, што чысціня ўспрымання свету, прастата не рудыменты мінулага, а сучаснае.

Інсітнае мастацтва — гэта своеасаблівае люстэрка, ключ, якія даюць магчымасць паглядзець на навакольную рэчаіснасць іншымі вачамі, убачыць некалькі шляхоў развіцця мастацтва і чалавечай цывілізацыі. Таму не выпадковая цікавасць да "наіву" ў 80—90-я гг. У Парыжы, Маскве, а потым і ў Мінску адбыліся выставы інсітнай творчасці. У 1999 г. жыхары Беларусі змаглі пазнаёміцца з выставай твораў чэшскіх і славацкіх мастакоў.

Такім чынам, сучасная беларуская культура багатая на постмадэрнісцкія тэндэнцыі. Гэта даволі актуальна, бо па сваёй сутнасці культурнае асяроддзе нашай краіны неардынарнае ў выніку дыялагічнасці і пагранічнасці саміх узораў беларускай культуры. Постмадэрнізм прапануе з павагай ставіцца да розных каштоўнасцей, традыцый, а ў мастацтве — да любых стыляў, кірункаў, школ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР